**УДК 930.85(476)**

# УВАСАБЛЕННЕ АРХЕТЫПА ГЕРОЯ Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ СУБ'ЕКТАЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

***У.А. ЖЫЛКО***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)***

*Абапіраючыся на архетыпічную тэорыю К.Г. Юнга, выяўляецца адметнасць увасаблення архетыпа героя ў мастацкай спадчыне суб'ектаў беларускай культуры на матэрыялах літаратуры і жывапісу XIX стагоддзя. Адзначаецца, што беларускія суб'екты сацыякультурных працэсаў XIX стагоддзя семантычна ўвасаблялі ў архетыпе героя якасці боскай пакоры, цярплівасці, негвалтоўнага асветніцкага супрацiву на аснове маральнасці, мірнага рэфармавання існуючай сітуацыі і непасрэднага змагання, адкрытай барацьбы за самавызначэнне, свабоду і справядлівасць.*

**Уводзіны.** Кожны гістарычны перыяд культурнага развіцця любой этнасацыяльнай супольнасці заўсёды адзначаны пэўнай сацыякультурнай мадэллю, якая з'яўляецца сімвалам часу і адлюстраваннем менталітэту людзей. Усеахопліваючымі сімваламі этнанацыянальнай самасвядомасці і адначасова культурнай субстанцыяй, якая спараджае імпульсы да яе станаўлення на падсвядомым узроўні, з'яўляюцца этнанацыянальныя архетыпы, якія характарызуюць асноватворныя ўласцівасці супольнасці, уплываюць на асаблівасці светаўспрымання, духоўныя арыентацыі і сацыякультурныя набыткі яе членаў [1, с. 26]. Архетыпы ўвасабляюцца ў шматлікіх мастацкіх вобразах, сімвалах, сюжэтах. На змястоўную афарбоўку інтэрпрэтацыі ўплывае сацыякультурны кантэкст: канкрэтныя вобразы, у якія праектуюцца архетыпы, заўсёды абумоўленыя не толькі калектыўным бессвядомым, але і эпохай з дамінантнай культурнай праграмай, якая спараджае іх.

Этнакультурныя архетыпы маюць моцны патэнцыял; на пачатковым этапе станаўлення беларускай нацыянальнай культуры XIX стагоддзя яны абумовілі культурную цэласнасць супольнасці, асаблівасці менталітэту беларускага народа, што наўпрост звязана з праявамі калектыўнага бессвядомага.

Тэарэтычна К.-Г. Юнг распрацаваў феномен "калектыўнага бессвядомага" – крыніцы чалавечай агульнасці, што складаецца з архетыпаў – першасных вобразаў, універсальных мадэлей канцэнтрацыі вопыту, назапашанага калектыўна ўсімі папярэднімі пакаленнямі [1, с. 190]. Архетыпічная тэорыя ў межах гуманітарыстыкі была пашыраная паслядоўнікамі К.-Г. Юнга: Э. Нойманам, М.Л. фон Францам, Дж. Хендэрсанам, Дж. Хілманам і іншымі. У айчыннай гуманітарнай навуцы разгляду архетыпаў прысвечаны працы У. Конана, Л. Кажухоўскай, А. Свечнікавай [2–4].

Мэта дадзенага даследавання – выявіць на падставе твораў беларускай літаратуры і жывапісу XIX стагоддзя адметнасць пераасэнсавання архетыпа героя ў кантэксце сацыякультурных парадыгм.

**Асноўная частка.** Пад сацыякультурнай парадыгмай мы разумеем, абапіраючыся на даследаванні Т. Куна, Н. Бакач, Н. Петрачэнка [5–7], феномен сэнсавай цэласнасці культурных адзінак у іх стылёвай сінхроннасці, у аснове якога – пэўны інтэгратыўны прынцып, аднолькава прадстаўлены ва ўсіх адначасовых феноменах сацыякультурнай рэчаіснасці і адносна якога дадзеныя з'явы могуць быць растлумачаныя як моманты культурнай цэласнасці. Сацыякультурная парадыгма ўяўляе сабой дамінуючую мысліцельную традыцыю, вызначае і стандартызуе стыль мыслення эпохі, па сутнасці выступае агульнастылёвым адзінствам канкрэтнага сацыякультурнага часу. Яна актуалізуе тую ці іншую традыцыю, задаючы тым самым на пэўным этапе развіцця культуры вядучы спосаб бытавання мовы і матэрыяльнага свету, а таксама канкрэтныя ўзоры чалавечай дзейнасці (прадпісанні, нормы, рэгулятывы, спосабы паводзін і вырашэння жыццёвазначных задач і г.д.), аб'ектывуючы, такім чынам, пануючыя сэнсы эпохі [6, с. 13]. Стыль культуры, у сваю чаргу, выступае як спосаб выражэння гэтых узораў у канкрэтнай сферы чалавечай дзейнасці згодна прадпісанням парадыгмы.

Полістылёвасць у беларускай сацыякультурнай сітуацыі XIX стагоддзя мы вызначаем як дамінуючую рысу. У айчыннай культуры можна лічыць XIX стагоддзе перыядам выражаных праз ідэйнамастацкія накірункі асветніцтва, рамантызму, рэалізму стыляў, адначасовае суіснаванне якіх абумоўлена сінтэзам сацыяльных і культурных фактараў розных парадыгм: асветніцкай, рамантычнай і дэмакратычнарэалістычнай. Дадзеная акалічнасць пэўным чынам абумовіла сімвалічнае ўвасабленне этнакультурных архетыпаў у мастацкай творчасці суб'ектаў беларускай культуры. Выкарыстанне архетыпічнай тэорыі ў культуралагічным даследаванні літаратуры і жывапісу XIX стагоддзя дае нам магчымасць вылучыць раней не даследаваныя аспекты культурных тэкстаў, выявіць адметнасць менталітэту беларускай супольнасці.

Адным з дамінуючых архетыпаў, увасобленых у творчасці сацыякультурных суб'ектаў XIX стагоддзя, выступае *архетып героя*. Варта згадаць, што раннія формы архетыпічных уяўленняў пра героя

адрозніваюцца непадзельнасцю вобразаў першапродка – героя-дэміурга (творцы): культурны герой можа быць і першапродкам, і пераўтварацца ў бога, і толькі пасля трансфармавацца ў рэлігійным, эпічным і казачным кантэкстах; культурны герой эвалюцыянуе і становіцца альбо чароўным персанажам – творцам, альбо эпічным першапродкам – волатам, альбо персанажам – героем чароўнай казкі [8, с. 47]. Герой выступае як надзвычайная выключная асоба – антаганіст, барацьбіт з пачварай, праявамі хаосу. У дачыненне да акрэсленай функцыі героя ў беларускай культуры XIX стагоддзя лагічна звярнуцца да разгляду пэўных мадэлей дзеяння па пераўтварэнню недасканалай рэчаіснасці. Накірунак супраціву і сродкі будуць абумоўленымі тагачаснай сацыяльнай несправядлівасцю і культурна-палітычнай акупацыяй.

Асветніцкая парадыгма, уплыў якой быў надзвычай адчувальным у беларускай сацыякультурнай сітуацыі пачатку XIX стагоддзя, вылучыла ў якасці дамінуючага архетыпа *героя-асветніка, героя-рэфарматара*. Самаразвіццё, адукацыя, асвета ў выглядзе плённай працы на карысць грамадства, служэнне Айчыне – своеасаблівы негвалтоўны супраціў, як дамінуючы выступае ў межах асветніцкай сацыякультурнай парадыгмы. У вершах Я. Чачот настойваў на неабходнасці асветы простага народу, бо бачыў у ёй найбагацейшы патэнцыял для станаўлення і развіцця нацыянальнай культуры. Асноўны шлях да гармоніі ў грамадстве ці сацыяльнай раўнавагі ляжыць праз маральнае ўдасканаленне людзей як важкі сродак пабудовы гарманічнай нацыі: “Я з сэрцам удзячным дар шчодры во гэты /Кладу перад вамі мрою: /Калі і для вас блісне промень асветы /Вы возьмеце дар мой з сабою” [9, с. 46].

Як змагар супраць несправядлівасці ўвасоблены ў беларускай культуры архетып *героя-гаспадара*, які падкрэслівае спробу перайначвання наяўнай сітуацыі шляхам рэфармавання. Шмат хто з прадстаўнікоў беларускай культуры XIX стагоддзя ў сваёй творчасці спрабаваў стварыць этычную мадэль ці абагульнены вобраз ідэальнага гаспадара з рысамі станоўчага народнага характару: сціпласць, ашчаднасць, гаспадарлівасць, гасціннасць, стрыманасць, шчодрасць, спагада, спачуванне. Канцэпт дбайнага гаспадара бярэ пачатак у народным эпасе і каляндарнай паэзіі. У якасці такога вобразнага ўвасаблення можна назваць суддзю Сапліцу з паэмы А. Міцкевіча “Пан Тадэвуш”: “Ён першы волю даў нам шляхце і сялянам, /І ў пояс кланяцца як перад грозным панам < … > /Клянуся, як на споведзі, не раз я бачыў: /Ён за адным сталом садзіўся з парабкамі, /Ды і з прыгоннымі сваімі – мужыкамі; /Плаціў за маламоцных часцяком падаткі, /А гэта ж не абы-якія там выдаткі!” [10, с. 196]. Герой-гаспадар выразна прадстаўлены ў творах Я. Баршчэўскага “Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” (вобразы шляхціца Завальні, пана Марагоўскага), Я. Лучыны “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся” (ляснік Грышка) і інш.

Дадзеная мадыфікацыя архетыпа героя сутракаецца і ў мастацка-публіцыстычных творах К. Каліноўскага. У вобразе Яські-гаспадара з-пад Вільні нам адкрываецца адметнае яго пераасэнсаванне: не праз здзяйсненне подзвігаў, а праз дальнабачнасць і адэкватны аналіз сітуацыі, патрыятызм, паважлівае стаўленне да мінуўшчыны, да гісторыі свайго краю праяўляецца змаганне героя супраць хаосу і несправядлівасці, што падкрэслівае значнасць вобраза як героя-гаспадара і *героя-змагара, героя-абуджальніка*. Герой у вобразе *паэта-абуджальніка, лірніка-вешчуна, музыкі-творцы* дамінуе ў творчасці: А. Міцкевіча (Густаў-Конрад у паэме “Дзяды”); У. Сыракомлі (вясковы лірнік); В. Каратынскага, Ф. Багушэвіча (Мацей Бурачок). У аўтарскіх інтэрпрэтацыях дадзеных вобразаў прасочваецца ідэя Ф. Шэлінга, які ў свой час сцвярджаў, што герой – боскі абраннік, які разам з тым самастойна можа развівацца як геній у сваім імкненні ўздзейнічаць на душы людзей, абудзіць іх і стварыць нанова свой шматпакутны народ і зрабіць яго шчаслівым.

Рамантычная парадыгма сацыякультурнага развіцця XIX стагоддзя выяўляецца ў беларускай культуры як увасабленне і пераасэнсаванне архетыпа героя ў вобразе *абаронцы, ваяра, змагара*, якога характарызуе рамантычны бунт асобы, адкрытае супрацьстаянне ў барацьбе за ідэю. У Адама Міцкевіча герой неаддзельны ад свайго народа, да якога належыць, ён выступае ў якасці прыклада для людзей, яго дзейнасць не толькі асабісты, але і супольны досвед у агульнай справе. Сродкамі рэалізацыі місіі выступае барацьба: заручыўшыся даверам ворагаў, Конрад Валенрод знішчае крыжакоў з мэтай абароны роднага літоўскага народа; Гражына бараніла народ ад тэўтонцаў, а мужа ад здрады; Яцак Сапліца пераараджаецца з неўтаймаванага ганарлівага маладзёна ў сапраўднага патрыёта свайго краю, рыхтуе шляхту да паўстання і аднаўлення дзяржаўнасці праз дамову з Напалеонам; Стольнік дапамагае канфедэратам у змаганні за Канстытуцыю 3 мая. Акрамя пералічаных мастацкіх вобразаў у якасці такой мадыфікацыі героя выступаюць рэальныя культурныя і нацыянальныя героі, імёны якіх назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю, паколькі менавіта ім належыць спроба змяніць існуючы лад у інтарэсах будучай нацыі.

Ідэалізацыя мінулых падзей і гістарычных асоб у мастацкай творчасці суб’ектаў беларускай культуры ілюстравана праз рэпрэзентацыю трагічных падзей (паўстанні 1794, 1830–1831 гг., 1863–1864 гг.) ды сапраўдных герояў тагачаснага нацыянальна-вызваленчага руху: Т. Касцюшкі, Т. Рэйтана, І. Дамейкі, Л. Нарбута, Т. Зана, Я. Ясінскага, Т. Ваўжэцкага, Э. Плятэр – дзейсных суб’ектаў нацыятворчага працэсу, усе яны гераічна змагаліся супраць дэспатызму за ідэал свабоды. Паводле філасофіі экзістэнцыялізму

супрацьстаянне аднаго неўзабаве становіцца каштоўнасцю для супольнасці: Я супрацьстаю, адпаведна МЫ існуем. Менавіта гэтым тлумачыцца спрадвечная патрэба ў лідары – пачынальніку, абуджальніку, абароніцы, актуальная для беларускай супольнасці на ўсе часы. Дадзеную адметнасць вобразнага ўвасаблення героя зафіксавалі: А. Міцкевіч у паэме “Пан Тадэвуш”; М. Андрыёлі на карцінах “Смерць Нарбута пад Дубічамі”, “Партрэт Л. Нарбута”, “Сцэна з літоўскага паўстання”, “Атака паўстанцаў”, “Вылазка паўстанцаў”; К. Ельскі ў надмагіллі Т. Ваўжэцкага; А. Ромер у “Партрэце паўстанца 1863”. Тут мы бачым, як рэальныя гістарычныя падзеі і асобы пачалі ўваходзіць у кодавую сістэму нацыянальнай культуры, набываць не толькі ідэалізаваны, а сімвалічны сэнс як прыватнае ўвасабленне этнакультурнага архетыпа героя.

Дэмакратычна-рэалістычная парадыгма XIX стагоддзя на першы план вынесла праўдзівае адлюстраванне сацыяльнага ладу і крытыку несправядлівасці. Выяўленыя ў мастацкай спадчыне суб’ектаў беларускай культуры сродкі супрацьстаяння героя можна ахарактарызаваць двухбакова: з аднаго – у якасці сродкаў выступае сумленная цяжкая праца, якая адначасова з’яўляецца неабходансцю фізічнага выжывання; з другога – праз пераадоленне і вытрымку нязгодаў, трагізм свайго становішча селянін выратоўвае душу і мацуецца праз пакуты ў гераічнасці. Менавіта сумленная праца надавала мудрасць *герою-цярпліўцу* (Таміла з аднайменнай паэмы В. Каратынскага, прадстаўнікі сялянства ў паэзіі Ф. Багушэвіча). Безабароннасць селяніна перад голадам адлюстравана ў вершах Ф. Багушэвіча “Араты – да жаваранка”, “Гуляй, душа”. У архетыпічным разуменні гераізм вобразаў заключаецца ў трагізме лёсу: маштабнасць і жывучасць зла, яго незнішчальнасць, неапраўданыя пакуты, безумоўна, выклікаюць адчуванне вострай несправядлівасці. Галоўная мэта жыцця герояў-пакутнікаў – не стаміцца супрацьстаяць злу, захаваць у сабе чалавечыя якасці, прайсці праз невыноснае выпрабаванне, праз тамленне духу, каб пераўтварыць энергію пакут у энергію актыўнага дзеяння, і ў гэтым бачыць своеасаблівае этычнае супрацьстаянне як варыянт барацьбы героя са злом.

У поруч вобразнаму ўвасабленню архетыпа героя-цярпліўца маем вобраз раба з адметнай сімвалічнай інтэрпрэтацыяй. Найбольш дакладна яго стварыў Ю. Азямблоўскі ў літаграфіі “Беларускі раб” – безнадзейнасць у постаці, экзістэнцыяльны страх у скіраваным долу поглядзе. Варта адзначыць, што станаўленне ў XIX стагоддзі беларускай нацыянальнай культуры і нацыі ўвогуле можна рэканструяваць праз гегелеўскі канцэпт “барацьбы за прызнанне”, у аснове якога ляжыць сістэма адносін гаспадара і раба. Экзістэнцыяльны страх, які падаўляе асобу, цяжкая праца на карысць іншага, якая ўмацоўвае дух, і ўрэшце рэшт уласная свабода гаспадара становяцца прыкладамі для раба – імпульсамі да змагання, што пераўтвараюць раба ў героя. Пачатак усведамлення ўсяго трагізму падняволенага становішча жыцця “ў астрозе” бачым у творчасці Ф. Багушэвіча, К. Каліноўскага. Наступным прыступкам набліжэння раба да героя павінна быць усведамленне неабходнасці вызвалення і пераадолення ўласнага рабскага становішча.

Атрымліваецца, што катэгорыю “гераічнае” неабходна разглядаць у непарыўнай сувязі з эстэтычнай катэгорыяй “трагічнае”. Трагічнай з’яўляецца не толькі барацьба героя за вышэйшыя ідэалы, але таксама і смерць за іх. Гатоўнасць ахвяраваць уласным жыццём выступае ў якасці абавязку (“Я вамі кіраваў, каб збыць нявolі путы, і абавязак мой за вас прыняць пакуты”, А. Міцкевіч [11]). Дадзеная акалічнасць абумовіла такую тыпалагічную рысу беларускай нацыянальнай культуры, як ахвярнасць архетыпа героя, дзе смерць выступае яго сімвалічным хрысціянскім атрыбутам. Доказам будуць ахвяраванне жыццём Яцака Сапліцы ў паэме “Пан Тадэвуш”, пакаранне смерцю К. Каліноўскага і яго паплечнікаў, якія ўвасабляюць духоўных лідараў таго часу: Я. Дамеля “Смерць Глінскага ў няволі”; Я. Сухадольскі “Смерць Кіпрыяна Гадэбскага…”, “Смерць Юзафа Панятоўскага”, “Сцэна з паўстання 1831”; І. Гараўскі “Смерць паўстанца”; М. Андрыёлі “Смерць Л. Нарбута пад Дубічамі”; К. Альхімовіч “Пахаванне на Урале”, “Смерць выгнанніка”, “Смерць М. Глінскага ў турме”.

Адметнасць інтэрпрэтацыі архетыпа героя ў дадзеных творах – аўтарская рэфлексія, скіраваная на абумоўленасць ахвяры праз гераічны подзвіг, які прадугледжвае барацьбу дзеля жыцця, дабра, шчасця, свабоды народа. Семантыка смерці ў XIX стагоддзі была наўпрост звязана з папярэдняй эпохай, калі сярод шляхты панаваў выраз “добрая смерць”. Прыклады гераічнай гібелі ваяроў розных эпох і народаў натхнялі да абавязку “добра памерці”, змагаючыся з ворагамі. Тым не менш XIX стагоддзе ўнесла адметнасць у трактоўку смерці – апроч гераічнай смерці ў змаганні мы бачым трагічную смерць у выгнанні як апафеоз стагоддзя імперскага панавання на нашай зямлі.

**Заключэнне.** Разгледжаны архетып героя ў якасці дамінуючага ў кантэксце сацыякультурных парадыгмаў XIX стагоддзя. У творах айчыннай літаратуры і жывапісу герой прадстаўлены ў разнастайных вобразах-мадыфікацыях: героя-асветніка, змагара, абаронцы, творцы, абуджальніка, рэфарматара, гаспадара. Суб’екты сацыякультурных працэсаў XIX стагоддзя пабудавалі пэўную мадэль-характарыстыку існавання і дзейнасці беларускага этнасу, актуальную для тагачаснай сацыякультурнай сітуацыі. Яна была адлюстраваная ў мастацтве як барацьба героя са злом, дзе сродкі барацьбы складалі шырокі арсенал – ад

пакорлівай хрысціянскай ахвярнасці, перамогі ворага шляхам маральнай перавагі, асветы, творчага рэфармавання да перайначвання рэчаіснасці праз адкрытую барацьбу з ворагам, праз узброенае змаганне за вышэйшыя ідэалы з усвядомленай гатоўнасцю ахвяраваць уласным жыццём.

ЛІТАРАТУРА


1. Юнг, К.-Г. Архетып и символ / К.-Г. Юнг. – М.: Renaissans, 1993. – 286 с.
2. Конан, У. Архетыпы нашай культуры / У. Конан // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 1. – С. 16–21.
3. Кажухоўская, Л.С. Станаўленне и карэляцыя базісных сімвалаў у нацыянальнай мастацкай карціне свету беларусаў: дыс. … канд. культуралогіі: 24.00.01 / Л.С. Кажухоўская. – Мінск, 2003. – 121 с.
4. Свечникова, Е.В. Универсальные и этнокультурные архетипы в современной белорусской антиутопии: автореф. дис. … канд. культурологии: 24.00.01 / Е.В. Свечникова. – Минск: БГУК, 2013. – 21 с.
5. Кун, Т. Структура научных революций / Т. Кун. – М.: Прогресс, 1977. – 300 с.
6. Бакач, Н.Б. Культурная парадигма как объект социально-философского анализа: автореф. дис. … канд. филос. наук / Н.Б. Бакач. – Волгоград: ВГПУ, 1998. – 24 с.
7. Петроченко, Н.В. Культурная парадигма как методологическое средство исследования хореографического искусства: автореф. дис. … д-ра культурологии / Н.В. Петроченко. – Кемерово: Кемеров. гос. ун-т культуры и искусств, 2005. – 23 с.
8. Миф, мечта, реальность: постнеклассические измерения пространства культуры / под ред. И.В. Мелик-Гайказян. – М.: Научный мир, 2005. – 256 с.
9. Чачот, Я. Свіцязь: Выбраныя творы / Я. Чачот. – Мінск: БелЭн, 1999. – 220 с.
10. Міцкевіч, А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве: шляхецкая гісторыя 1811–1812 гг.: у 12-ці кн. вершамі / А. Міцкевіч. – Мінск: Маст. літ., 1998. – 367 с.
11. Міцкевіч, А. Дзяды: у 2-х т. Т. 2 (пераклад: С. Мінскевіч) / А. Міцкевіч. – Мінск: Медысонт, 1999. – 264 с.


*Пастурiў 27.02.2015*

## THE EMBODIMENT OF THE ARCHETIPE OF HERO IN THE ARTISTIC HERITAGE OF THE SUBJECTS OF THE BELARUSIAN CULTURE OF THE XIX CENTURY

***U. ZHYLKO***

*Using the Jungian archetypal theory it is analyzed the feature of the interpretation and discussed archetype of Hero in the artistic heritage of the subjects of Belorussian culture (based on the art and literature of the XIX century). It is noted that the subjects of social and cultural paradigms of the XIX century based on the interpretation of the archetype of the Hero built a harmonious model-specific characterization of the existence of the Belarusian nation, as evidenced by the combination of the Hero archetype within the semantic realization of the patience, non-violent resistance by improving morality, reform of the existing situation and direct competition, the fight against injustice for highest ideals of the freedom, truth and justice.*